✓ **12 студзеня** ў выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё выставы **«Фарфоравае асарці».**

У экспазіцыі прадстаўлена каля 500 фарфоравых прадметаў: казачныя і літаратурныя героі, цыркавыя артысты, балерыны і вулічныя музыканты, выявы жывёл, бюсты кампазітараў, паэтаў і пісьменнікаў, плакеткі, талеркі, кубкі, чарніліцы, алоўніцы, сервізы і іншыя прадметы інтэр'еру, а таксама вырабы з фарфору на




сентыментальна-пастаральныя сюжэты, навагоднюю і касмічную тэмы.

Асаблівым гонарам калекцыі з'яўляюцца фарфоравыя статуэткі казачных персанажаў «Чырвоны Каптурок і Шэры Воўк» (Германія, другая палова XX ст.), «Бураціна» (Ленінградскі фарфоравы завод, Расія, XX ст.), «Гусі-лебедзі» (Дулёўскі фарфоравы завод, Расія, XX ст.) і інш.

Сярод разнажанравых скульптур вакалістаў, акцёраў, музыкаў, артыстаў цырка, танцораў вылучаюцца фарфоравыя статуэткі «Балерына Бусел» і «Балерына Кошка» (Дзмітраўскі фарфоравы завод (Вербілкі), Расія, другая палова XX ст.). Пры стварэнні статуэтак скульптары І. Апаковіч і М. Інтызаран натхняліся спектаклем «Бусляня», дзіцячым балетам, пастаўленым у 1937 г. навучэнцамі Маскоўскага харэаграфічнага вучылішча. Цікава, што ролю цэнтральнага персанажа балета – Кошкі – сыграла вучаніца трэцяга класа Мая Плісецкая.

Некалькі вітрын у экспазіцыі займаюць унікальныя статуэткі жывёльнага свету розных кантынентаў зямнога шара, у тым ліку жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Не пакінуць абыякавымі наведвальнікаў і кампазіцыі з фарфоравых ваз розных памераў, гонарам серыі можна лічыць вазы рознай афарбоўкі, выпушчаныя ў 1950-х гадах.

Выстава аб'яднала фарфор заводаў Беларусі, Расіі, розных краін Еўропы.

Фарфаравую калекцыю для выставы прадставіў Віктар Сувораў, член праўлення Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання калекцыянераў.

З фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў экспазіцыі прадстаўлены альбомы рэпрадукцый, энцыклапедыі, прысвечаныя гісторыі ўзнікнення фарфору і развіцця яго вытворчасці ў свеце.

Выстава будзе працаваць да 12 снежня 2023 года.